Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”
______________ В.Ю.Шуцілін
29.06 2021 г.
Рэгістрацыйны № УД 4841-21 /уч.

# Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі

Вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці

1-24 01 02 «Правазнаўства»

2021

## СКЛАДАЛЬНІК

*Лянцэвіч В.М.,* дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт", кандыдат гістарычных навук, дацэнт

## РЭЦЭНЗЕНТЫ:

*Вішнеўская І.У.,* дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Інстытута кіраўнічых кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

*Кулеш А.У.,* дацэнт кафедры міжнароднага права Установы адукацыі Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі "Міжнародны ўніверсітэт "МІТСО", кандыдат гістарычных навук, дацэнт па спецыяльнасці "Права"

## РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай тэорыі і гісторыі права Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт"
(пратакол № 13 ад 26.05. 2021 г.);

Навукова-метадычным саветам Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт"
(пратакол № 5 ад 22.06.21 г.).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі” распрацавана для студэнтаў вышэйшых навучальных установаў па спецыяльнасці 1-24 01 02 “Правазнаўства” ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці і з’яўляецца фундаментальная тэарэтыка-прававой дысцыплінай кампанента ўстановы адукацыі.

Палітычная і прававая думка заўсёды была звязана з сучаснай ёй палітыка-прававой рэчаіснасцю. Паколькі кожная эпоха беларускай гісторыі мела своеасаблівыя палітычныя ўстановы, прававыя інстытуты, у творах нацыянальных мысліцеляў, рэлігійных, дзяржаўных, грамадскіх дзеячаў, асветнікаў, літаратараў і інш. адлюстроўваліся розныя палітыка-прававыя праблемы, цесна звязаныя з асаблівасцямі мясцовых дзяржаўных устаноў і прынцыпаў права. Фарміруючыся разам з дзяржавай, палітыка-прававая думка адлюстроўвае адносіны розных сацыяльных груп да палітыкі дзяржавы, права, узаемадзеянне дактрын, поглядаў, імкненне кожнага аўтара абгрунтаваць сваю думку, ідэю, абараніць інтарэсы сваёй сацыяльнай групы.

Прадметам гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі з’яўляюцца тэарэтычныя палажэнні аб дзяржаве і праве, заканадаўстве і палітыцы, выказаныя нацыянальнымі мысліцелямі, грамадскімі, дзяржаўнымі, рэлігійнымі дзеячамі, літаратарамі, навукоўцамі, публіцыстамі ў той ці іншай форме. Дадзеная вучэбная дысцыпліна адначасова вывучае як палітыка-прававыя вучэнні (тэорыі, канцэпцыі), так і асабістыя выказванні, думкі, не развітыя да ўзроўню асобных самастойных арыгінальных тэорый.

**Галоўная мэта** вывучэння дысцыпліны – знаёмства з палітыка-прававымі поглядамі нацыянальных мысліцеляў таго ці іншага перыяду, атрыманне ведаў пра гісторыю ўзнікнення і развіцця тэарэтычных ведаў аб дзяржаве, праве, палітыцы і заканадаўстве з X стагоддзя да сенняшніх дзён, а таксама разуменне прычын і асаблівасцяў развіцця дзяржавы і права на асобных гістарычных этапах; садзейнічаць фарміраванню нацыянальнай свядомасці, гордасці за сваю гісторыю, культуру, дзяржаву, народ, які стварыў сапраўдныя культурныя каштоўнасці, каторыя ўвайшлі ў скарбонку сусветнай культуры.

У сістэме юрыдычных дысцыплін гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі адносіцца да гісторыка-тэарэтычнага блоку. Яна непасрэдна звязана з такімі навукамі, як агульная тэорыя права, гісторыя дзяржавы і права замежных краін і Рэспублікі Беларусь, гісторыя палітычных і прававых вучэнняў. Як гістарычная навука, яна звязана з гісторыяй Беларусі, гісторыяй беларускай культуры, гісторыяй нацыянальна-філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, беларусазнаўствам.

Галоўныя **задачы** вывучэння дысцыпліны. Студэнты, якія вывучаюць “Гісторыю палітычнай і прававой думкі Беларусі”:

– павінны мець уяўленне аб этапах станаўлення палітыка-прававой думкі на беларускіх землях, аб іх ролі ў развіцці палітыка-прававых інстытутаў;

– арыентавацца ў вялікім і разнастайным спектры палітычных і прававых поглядаў, ідэй, канцэпцый, дактрын, выдзяляць думкі, якія адпавядаюць

сацыяльнаму прагрэсу, справядлівасці, і наадварот, стрымліваюць развіццё грамадства, дзяржавы, заканадаўства, кансервуюць аджыўшыя палітыка-прававыя інстытуты;

– мець навыкі вядзення дыскусіі, адстойвання сваіх асабістых поглядаў, прымянення ў практычнай дзейнасці прававеда гістарычных здабыткаў прагрэсіўнай палітыка-прававой думкі беларускага народа.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі" фарміруюцца наступныя кампетэнцыі:

*акадэмічныя кампетэнцыі:*

- АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;
- АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;
- АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі;
- АК-4. Умець працаваць самастойна;
- АК-5. Быць здольным выпрацоўваць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю);
- АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем;
- АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;

*сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:*

- САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці;
- САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
- САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасным камунікацыях;
- САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;
- САК-6. Умець працаваць у камандзе;
- САК-7. Выконваць патрабаванні прававых актаў у прафесійнай і іншых сферах сваёй жыццядзейнасці;
- САК-8. Выконваць правілы прафесійнай этыкі;

*прафесійныя кампетэнцыі:*

- ПК-1. Абараняць гарантаваныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і іншымі заканадаўчымі актамі асабістыя правы і свабоды, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя правы грамадзян, канстытуцыйны лад Рэспублікі Беларусь, дзяржаўныя і грамадскія інтарэсы;
- ПК-73. Выкладаць юрыдычныя і эканамічныя дысцыпліны на сучасным навукова-тэарэтычным і метадычным узроўнях ва ўстановах агульнай сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі;
- ПК-74. Ажыццяўляць прававую і эканамічную асвету.

У выніку вывучэння дысцыпліны "Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі" студэнты павінны:

**ведаць:**

- асноўныя прававыя канцэпцыі, якія былі сфармуляваны нашымі папярэднікамі і адыгралі значную ролю ў развіцці дзяржаўнасці і права нашай краіны, а таксама іншых краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы;

- асноўныя тэрміны, паняцці, катэгорыі гісторыі палітычнай і прававой думкі як навукі, метадалагічныя асновы яе вывучэння;

- суб’ектыўныя і аб’ектыўныя фактары, якія ўплывалі на развіццё палітычнай і прававой думкі беларускіх зямель;

- як ішло станаўленне палітыка-прававой думкі, якую ролю адыгрывалі тыя ці іншыя ідэі, погляды, дактрыны ў развіцці палітыка-прававых інстытутаў.

**умець:**

- аналізаваць палітычныя і прававыя вучэнні мінулых эпох, бачыць іх гістарычнае значэнне, вылучаць іх асаблівасці;

- арыентавацца ў вялікім і разнастайным спектары палітычных і прававых поглядаў, ідэй, канцэпцый, дактрын, выдзяляць думкі, якія адпавядаюць сацыяльнаму прагрэсу, справядлівасці, і наадварот, стрымліваюць развіцце грамадства, дзяржавы, заканадаўства, кансервуюць аджыўшыя палітыка-прававыя інстытуты;

- працаваць з першакрыніцамі, навуковай літаратурай;

- фармуляваць асабістую пазіцыю па вызначаных праблемах на аснове набытых ведаў, афармляць іх у выглядзе эсэ;

- крытычна і незалежна ацэньваць навуковыя і гістарычныя матэрыялы, розныя пункты гледжання, лінію аргументацыі.

**мець навыкі:**

- вядзення дыскусіі, адстойвання сваіх асабістых поглядаў, прымянення ў практычнай дзейнасці прававеда гістарычных здабыткаў прагрэсіўнай палітыка-прававой думкі беларускага народа.

**валодаць:**

- асноўнымі метадамі спосабамі і сродкамі атрымання, перапрацоўкі гісторыкам прававой інфармацыі.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі: дзённая, завочная, завочная на базе вышэйшай адукацыі (ВШУБ).

Агульная колькасць і колькасць аўдыторных гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (накірунку спецыяльнасці):

– вучэбны план курса дзённай формы атрымання адукацыі прадугледжвае 168 гадзін, з іх 66 аўдыторных гадзін. Лекцыйны курс разлічаны на 44 вучэбныя гадзіны (з іх 4 газдіны КСР), а цыкл семінарскіх заняткаў – на 22 вучэбныя гадзіны (з іх 2 гадзіны КСР);

– для завочнай формы атрымання адукацыі прадугледжана 168 гадзін, з іх 16 аўдыторных гадзін. Лекцыйны курс разлічаны на 12 вучэбных гадзін, а цыкл практычных заняткаў – на 4 вучэбныя гадзіны;

– для завочнай на базе вышэйшай формы атрымання адукацыі (ВШУБ) прадугледжана 168 гадзін, з іх 14 аўдыторных гадзін. Лекцыйны курс разлічаны на 10 вучэбных гадзін, а цыкл практычных заняткаў – на 4 вучэбныя гадзіны.

Размеркаванне аўдыторнага часу па відах заняткаў, курсах, семестрах:

| Форма атрыман-ня адукацыі | Курс | Семестр | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|---|
| | | | лекцыі | семінарскія/ практычныя заняткі |
| дзённая | 3 | 5 | 44 | 22 |
| завочная | 3 | 5, 6 | 12 | 4 |
| завочная (ВШУБ) | 3 | 1, 2 | 10 | 4 |

Формы бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне: праверка эсэ, рэфератаў, тэстаў, вуснае і пісьмовае апытанне, заслухоўванне дакладаў, праверка пісьмовых кантрольных работ.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

## Тэма 1. Прадмет, задачы, крыніцы, гістарыяграфія курса “Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі”. Праблемы перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі

Прадмет і задачы курса “Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі”. Метадалогія гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі.

Крыніцы і асноўныя праблемы курса. Гістарыяграфія курса. Праблемы перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі.

## Тэма 2. Палітычная і прававая думка на беларускіх землях ў часы распаўсюджвання хрысціянства і ўтварэння першых дзяржаў-княстваў (X – першая палова XIII стст.)

Грамадская думка дахрысціянскай пары. Язычніцтва – светапоглядная аснова духоўнага жыцця старажытных насельнікаў Беларусі. Фальклор – як адлюстраванне грамадска-палітычнай думкі.

Асноўныя фактары і перадумовы фарміравання палітычнай і прававой думкі Беларусі ў X–XIII стст. Асаблівасці хрысціянізацыі беларускіх зямель у X–XIII стст. Сутнасць ідэалогіі цэзарапапізма і прычыны яе зацвярджэння ў палітычнай думцы Беларусі XI–XIII стст.

Палітычныя і прававыя ідэі старажытнага перыяду. Грамадска-палітычныя погляды Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Клімента Смаляціча. Палітычныя ідэі старажытных летапісаў і “Слова пра паход Ігараў”.

## Тэма 3. Грамадска-палітычная і прававая думка ў перыяд станаўлення беларускага этнаса і ўмацавання дзяржаўнасці (другая палова XIII – XV стст.)

Кансалідацыйныя тэндэнцыі на беларускіх землях у першай палове XIII ст. Знешнія прычыны абяднання старажытных беларускіх і літоўскіх зямель у адзіную дзяржаву – Вялікае Княства Літоўскае. Адзінства, цэнтралізацыя, магутнасць краіны – асноўныя ідэі летапісаў XV ст. Змест і ідэйны сэнс “Летапісца Вялікіх князёў Літоўскіх”. Ідэя гістарычнай еднасці ўсіх усходніх славян і неабходнасці палітычнага аб’яднання літоўскіх і славянскіх зямель у адзінай дзяржаве – асноўны стрыжань “Беларуска-літоўскага летапіса 1446 г.” “Хроніка Быхаўца” – помнік агульнадзяржаўнага беларуска-літоўскага летапісання.

Прыняцце каталіцызму. Знаёмства з заходнееўрапейскай царкоўна-палітычнай ідэалогіяй папства (папацэзарызм). Падзел ўсходнеславянскай праваслаўнай царквы на маскоўскую і беларуска-украінскую. Адметныя рысы заходняга праваслаўя.

Рэлігійна-палітычныя супярэчнасці і іх адлюстраванне ў палітычнай і прававой думцы. Ідэя царкоўнай незалежнасці праз стварэнне аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў ВКЛ. Барацьба за аўтакефалію ў часы кіравання

Гедыміна, Альгерда, Вітаўта, Казіміра. Дзейнасць і палітычныя погляды Рыгора Цамблака. Палітычныя ідэі сярэднявечных ерасяў у ВКЛ.

Ідэя уніі паміж праваслаўнай і каталіцкай царквамі ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі XIV – XV стст. Спробы яе рэалізацыі.

Ідэйныя падставы для існавання палітычнай апазіцыі ў ВКЛ XIV – XV стст. і сродкі яе барацьбы з урадам.

Развіцце прававой думкі ў XIV – XV стст. Прававыя ідэі грамат, прывілеяў, ухвал, судзебнікаў і іншых законадаўчых актаў XIV – XV стст.

## Тэма 4. Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі ( XVI – пачатак XVII ст.)

Перадумовы і асаблівасці фарміравання палітычнай і прававой думкі эпохі Рэнесансу на Беларусі. Беларускае Адраджэнне – працяг агульнаеўрапейскіх прынцыпаў і тэндэнцый. Спецыфічныя рысы рэнесансавай палітыка-прававой думкі Беларусі.

Два напрамкі палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI ст. Асаблівасці і змест памяркоўна- гуманістычных поглядаў на грамадства, дзяржаву, палітыку, права, судовы лад і судаводства. Палітычныя і прававыя погляды Ф. Скарыны. Ф. Скарына аб ідэальных дзяржаўна-прававых формах. Класіфікацыя права, прапанаваная Ф. Скарынай. Сэнс ідэі “агульнага дабра”. Асаблівасці рэлігійных поглядаў Ф. Скарыны. “Песня пра зубра” – крыніца вывучэння палітычных і прававых поглядаў М. Гусоўскага.

Палітычныя і прававыя погляды М. Літвіна. Трактат “Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян” – асноўная крыніца вывучэння поглядаў М. Літвіна на грамадскі і палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага. М. Літвін аб шляхах удасканалення судовага ладу і судовага працэсу.

Палітычныя і прававыя погляды ідэолагаў Рэфармацыі. Сутнасць ідэалогіі Рэфармацыі. Лютэранства, кальвінізм, анцітрынітарызм (арыянства) – напрамкі пратэстантызма, распаўсюджаныя на тэрыторыі Беларусі ў XVI ст. Асноўныя прычыны папулярнасці кальвініскіх ідэй ў Беларусі. Беларускія мысліцелі – ідэолагі Рэфармацыі.

Палітычныя погляды прадстаўнікоў лютэранства. А. Кульва.

Андрэй Волан – выдатны беларускі правазнаўца. Погляды А. Волана на паходжанне і функцыі дзяржавы, форму палітычнага кіравання, грамадскі лад. Погляды А. Волана на права і яго функцыі. Суадносіны “права” і “свабоды”. А. Волан аб “натуральных” правах.

Прававыя ідэі Л. Сапегі. Статут 1588 г. – адлюстраванне палітыка-прававых поглядаў канцлера ВКЛ Л. Сапегі. Супярэчлівасці ў палітычных і прававых поглядах Л.Сапегі. Абгрунтаванне Л.Сапегам прынцыпа рэлігійнай талерантнасці, як вядучага прынцыпа ўнутраннай палітыкі шматканфэсійнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага.

Два напрамкі анцітрынітарызму. Палітычныя і прававыя погляды правага крыла анцітрынітарыяў. Эвалюцыя поглядаў Сымона Буднага на дзяржапву і права. Палемічны твор “Аб свецкай ўладзе”, гісторыя яго стварэння, асноўныя

ідэі. С. Будны аб функцыях дзяржаўнай ўлады і метадах яе ўздзеяння на грамадзян.

Праблема фарміравання нацыянальнай свядомасці, захавання нацыянальнай мовы і традыцый у творчай спадчыне В. Цяпінскага.

Палітычныя і прававыя погляды радыкальнага крыла анцітрынітарыяў. (П. Гезка, М. Чаховіц, Л. Крышкоўскі, Якуб з Калінаўкі і інш.). Сацыяльная база радыкальнай ідэалогіі. Паняцце “свабоды” ў сацыяльным разуменні. Адносіны да дзяржаўнай улады, прыватнай маёмасці, удзелу хрысціяніна ў войнах. Шляхі і сродкі барацьбы за сацыяльную свабоду, роўнасць, справядлівасць, прапанаваныя сялянска-плябейскімі рэвалюцыянерамі.

Адносіны радыкалаў да антычнай спадчыны. Супярэчлівасць ідэалогіі радыкальных гуманістаў. Крыніцы вывучэння поглядаў радыкальных гуманістаў.

Абмеркаванне ў палітыка-прававой думцы ВКЛ прынцыпаў дзяржаўнай уніі з Польскім Каралеўствам. Развіццё прававой думкі ў Статутах ВКЛ XVI ст. Замацаванне ў заканадаўчых актах палітыка-прававых ідэй Адраджэння і Рэфармацыі.

## Тэма 5. Палітычная і прававая думка перыяду Контррэфармацыі, Брэсцкай царкоўнай уніі і крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін (XVII – сярэдзіна XVIII ст.)

Сэнс ідэалогіі і палітыкі Контррэфармацыі. Асноўныя прычыны распаўсюджвання контррэфармацыйнай ідэалогіі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Дзейнасць ордэна езуітаў у Беларусі. Накіраванасць ідэалогіі контррэфармацыі ў Беларусі супраць пратэстантызму і праваслаўя. Палітычныя і прававыя погляды лідэраў Контррэфармацыі на Беларусі (Пётр Скарга). Крыніцы вывучэння поглядаў П. Скаргі. Погляды П. Скаргі на палітычны лад, заканадаўства, суадносіны паміж свецкай і духоўнай уладамі. Сацыяльныя погляды П. Скаргі. Паняцце “свабода” ў творчасці П. Скаргі. Праграма ўніі паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі, абгрунтаваная П. Скаргай.

Прычыны заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. Іпацій Пацей – абаронца міжцаркоўнай уніі. Крытыка Пацеем канцэпцыі ўніі, прадстаўленай К. Астрожскім у “Лісце да М. Рагозы”. Асаблівасці праграмы ўніі, падрыхтаванай І. Пацеем, барацьба за яе ажыццяўленне. Творы І. Пацея “Ліст да князя Канстанціна Астрожскага”, “Размовы берасцяніна з братчыкамі” і інш. – абгрунтаванне неабходнасці еднасці хрысціянскіх канфесій у адзінай дзяржаве.

Палітычныя і прававыя ідэі ў рэлігійнай палеміцы. Антыўніяцкія праваслаўныя палемісты: Мелецій Сматрыцкі, Афанасій Філіповіч, Захарый Капысценскі, Іван Вішэнскі і інш. Абаронцы уніі: Іосіф Руцкі, Іпаці Пацей, Іасафат Кунцэвіч і інш. Пытанні народнасці, “сапраўднай царквы”, суадносін паміж свецкай і духоўнай уладамі, суверэннага грамадства і “грамадскага дабра” – у палемічных творах XVII ст. Канцэпцыя монацаркоўнай дзяржавы ў разуменні І. Пацея, І. Руцкага. Праект уніяцкага патрыяршаства І. Руцкага.

Праблемы права народаў (М. Сматрыцкі, Т. Цішкевіч-Скуміновіч). Сацыяльныя супольнасці і суверэннасць грамадства ў творах уніяцкіх палемістаў. Вынікі рэлігійнай палемікі.

Пачатак вышэйшай юрыдычнай адукацыі ў Беларусі і Літве. Натуральна-прававыя ідэі ў працах А. Алізароўскага. Кніга Алізароўскага "Аб палітычнай супольнасці людзей". Алізароўскі аб паходжанні, сутнасці і функцыях дзяржавы. Класіфікацыя права. Канцэпцыя свабоды і роўнасці ў творчасці Алізароўскага.

Ідэалогія сарматызму: прававое і палітычнае мысленне ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Атэістычныя і сацыяльна-ўтапічныя погляды К. Лышчынскага. Трактат "Аб неіснаванні бога", "Маніфест аб атэізме" – асноўныя крыніцы вывучэння поглядаў К. Лышчынскага.

Грамадска-палітычныя і прававыя погляды С. Полацкага. Сінтэз двух культурных еўрапейскіх напрамкаў – светапоглядая аснова асветніцкай дзейнасці С. Полацкага. Думкі мысліцеля аб прававой роўнасці людзей, справядлівым заканадаўстве і судзе.

А. Алізароўскі, К. Лышчынскі, С. Полацкі – прадвеснікі асветніцкіх ідэй у Беларусі

## Тэма 6. Палітычная і прававая думка Беларусі ў эпоху Асветніцтва (XVIII ст)

Ідэалогія Асветніцтва – сутнасць, прычыны распаўсюджання ў еўрапейскіх краінах. Агульные рысы праграм рэфармавання грамадства, прапанаваных Дж. Локам, М Вальтэрам, Мантэск'е, Д. Дзідро, Ж-Ж. Русо і інш. асветнікамі.

Распаўсюджванне асветніцкай ідэалогіі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Асаблівасці асветніцкай ідэалогіі ў Беларусі і Літве, яе супярэчлівасць, непаслядоўнасць.

Грамадска-палітычныя і прававыя ідэі ў гістарычных сачыненнях першай паловы XVIII ст. (К. Галоўка "Сеймуючая Еўропа", І. Карпінскі "Геагрфічны слоўнік", Ф. Папроцкі "Найбольш значныя войны", "Аб рыцарскім пытанні ў Польшчы"). Асветніцкая канцэпцыя ў гістарычнай навуцы (А. Нарушэвіч, Т. Гусаржэўскі). Развіцце гістарычнага крыніцазнаўства: "Валюміна легум" (Кніга законаў) С. Канарскага, "Дыпламатычны кодэкс" М. Догеля.

Палітычныя і сацыяльныя ідэі "Вольнага голасу ў абарону свабоды". Праблемы рэфармавання палітычнага ладу Рэчы Паспалітай ў працы С. Канарскага "Аб паспяховым спосабе правядзення паседжанняў". Крытыка палітычнага ладу Рэчы Паспалітай К. Нарбутам. Ідэі кнігі К. Нарбута "Логіка або навука разважання і разумнай размовы". Праца А. Загурскага "Пра высакароднасць, неабходнасць і карысць юрыспрудэнцыі ці прававой разважлівасці". Праблемы павышэння аўтарытэта закона і прававога выхавання насельніцтва.

Навуковы аналіз сістэмы права Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага ў працах Т. Астроўскага.

Праваахоўчая думка Вялікага Княства Літоўскага. Палітычна-прававыя погляды Г. Каніскага, выкладзенные ў творах "Правы дысідэнтаў" і "Правы і свабоды дэсідэнтаў хрысціянскага веравызнання Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага…". Праблемы асабістага і калектыўнага (агульнага) у творчасці Г. Каніскага.

Сутнасць ідэалогіі фізіякратызму. Прадстаўнікі фізіякратаў у Беларусі (І. Страйноўскі, І. Храптовіч, К. Багуслаўскі, М. Карповіч, П. Бжастоўскі і інш.). Крытыка сацыяльна-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай. Праграма рэфармавання грамадства. Асветнікі-рэфарматары: І. Храптовіч, А. Тызенгаўз, П. Бжастоўскі. Натуральна-прававая канцэпцыя ў асветніцкай думцы Беларусі (І. Страйноўскі "Навука аб натуральным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў", І. Храптовіч "Аб праве прыроды").

Палітычныя і прававыя ідэі Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Адлюстраванне прынцыпаў прававой дзяржавы ў Канстытуцыі 1791 г. Палітычныя і прававыя ідэі лідараў паўстання 1794 г. Творы Т. Касцюшкі: "Мемарыял аб Польшчы" (1793 г.), "Паланецкі ўніверсал" (1794 г.), "Ці могуць палякі дамагчыся незалежнасці?"( 1800 г.) як крыніца вывучэння палітыка-прававых поглядаў рэвалюцыянера і мысліцеля. Рэспубліканскія і дэмакратычныя ідэі Я. Ясінскага. Крытыка асноў феадальнага грамадства ў паэтычнай спадчыне Я. Ясінскага (паэмы "Спрэчкі", "Цянця").

І. Яленскі – прадстаўнік радыкальнага ўтапізму ў грамадска-палітычнай і прававой думцы Беларусі XVIII ст. Уяўленне аб ідэальным грамадстве, заснаваным на сацыяльнай, палітычнай і прававой роўнасці ў творы "Благавесць да Ісраіля Расійскага". Утапічны сацыялізм С. Зяновіча.

## Тэма 7. Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.)

Уплыў польскай и расійскай палітыка-прававой думкі на фарміраванне ўласна беларускай палітычнай і прававой думкі. Пытанні адраджэння дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага ў грамадска-палітычнай думцы канца XVIII – пачатку XIX ст. Праект адраджэння палітычнай самастойнасці Вялікага Княства Літоўскага М.К. Агінскага.

Асноўныя накірункі палітычнай і прававой думкі на беларускіх землях у XIX – пачатку XX ст.: ліберальна-буржуазны, кансерватыўна-манархічны, рэвалюцыйна-дэмакратычны.

Прагрэсіўныя традыцыі палітычнай і прававой думкі Беларусі ў дзейнасці выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага ўніверсітэта – ідэйнага цэнтра лібералізма. Ліберальныя ідэі братоў Яна і Анджэя Снядэцкіх, Яна Зноска, Міхаіла Баброўскага. Фарміраванне патрыятычнага накірунку ў гістарычнай навуцы: І. Даніловіч, Ю.Ярашэвіч, Т.Нарбут. Палітычныя і прававыя погляды сяброў тайных студэнцкіх таварыстваў Віленскага ўніверсітэта – філаматаў і філарэтаў (Адам Міцкевіч, Юзэф Яжоўскі, Тамаш Зан, Ігнат Дамейка і інш.). Ліберальна-буржуазны напрамак палітыка-прававой думкі Беларусі 1880-90 гг. Ідэя палітычнага кампрамісу з самадзяржаўем. "Мінскі лісток" – орган беларускай

ліберальнай думкі. Праграма ліберальных рэформаў. Нацыянальнае пытанне ў поглядах беларускіх лібералаў канца XIX ст.

Ідэі культурна-нацыянальнага адраджэння ў літаратуры першай паловы XIX ст. (Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Аляксандр Рыпінскі, Уладзіслаў Сыракомля, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч). Вільна, Мінск, Віцебск – тры цэнтры інтэлектуальнага жыцця Беларусі 30-50 гг. XIX ст. Гістарычная ліцвінская свядомасць – светапоглядная аснова палітычных поглядаў Адама Кіркора.

Узмацненне кансерватыўнага напрамку ў палітычнай і прававой думцы пасля паўстання 1830-1831 гг. Часопісы "Рубон", "Віленский вестник", "Вестник Западной России". Ідэя "заходнерусізму" ў палітычнай думцы Беларусі. Погляды М. Каяловіча, І.Саланевіча, К. Гаворскага.

Рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак грамадска-палітычнай і прававой думкі Беларусі: Міхаіл Валовіч, Юльян Бакшанскі, браты Далеўскія. Франц Савіч і арганізацыя "Дэмакратычнае таварыства". Статут арганізацыі. Праграма дэмакратычных пераўтварэнняў грамадства Кастуся Каліноўскага. "Мужыцкая праўда" як крыніца вывучэння поглядаў К.Каліноўскага. Распаўсюджванне марксізму ў Беларусі.

Развіццё юрыдычнай думкі: ураджэнцы Беларусі – выкладчыкі ўніверсітэтаў Уладзімір Спасовіч, Леў Петражыцкі, Іван Файніцкі.

## Тэма 8. Палітычная і прававая думка беларускага нацыянальнага Адраджэння ў канцы XIX – першай трэці XX ст. Ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці ў палітычнай думцы Беларусі (1914 – 1921 гг.)

Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі ў канцы XIX – пачатку XX ст. (Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Гурыновіч). Часопіс "Гоман" з праграмай федэратыўнай незалежнасці Беларусі. Утварэнне Беларускай Сацыялістычнай Грамады (БСГ). Спалучэнне ідэі сялянскага (народніцкага) сацыялізма з патрабаваннем нацыянальнага адраджэння ў праграме БСГ. Уздым нацыянальнага беларускага руху ў час першай рускай рэвалюцыі (1905 – 1907 гг.). Нацыянальна-асветніцкая і рэвалюцыйна-прапагандысцкая дзейнасць першых легальных беларускамоўных газет: "Наша доля" і "Наша Ніва".

Уздзеянне мастацкай літаратуры пачатку XX ст. на фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў (З. Жылуновіч, Я. Купала, Я. Колас, Цетка і інш.).

Актывізацыя беларускага нацыянальнага руху ў напрамку распрацоўкі канцэпцыі нацыянальнай дзяржаўнасці з пачаткам Першай сусветнай вайны. Тры цэнтры беларускага вызваленчага руху. Распрацоўка канцэпцыі нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускім народным камітэтам (БНК) у Вільні: Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі. Станаўленне нацыянальна-дзяржаўнай ідэі ў праграмных дакументах беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску (БНК, ЦБР, ЦВБР, ВБР). Ідэі дакументаў, прынятых першым Усебеларускім з ездам (снежань 1917 г.) Пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў праграмных дакументах БНР (Устаўныя граматы). Абгрунтаванне права Беларусі на свабоднае дэмакратычнае развіццё у творчай

спадчыне ідэолагаў нацыянальнага Адраджэння І. і А. Луцкевічаў, В. Ластоўскага, А. Смоліча, Я. Лёсіка, А. Цвікевіча і інш.

Палітычныя і прававыя погляды Уладзіміра Самойлы (Суліма). Эсэ У. Самойлы "Гэтым пераможам!.." Ігнат Абдзіраловіч (Канчэўскі) і яго эсэ "Адвечным шляхам (Дасьледзіны беларускага сьветапогляду)".

## Тэма 9. Палітычныя і прававыя ідэі Савецкай Беларусі

"Маніхфэст Часовага рабоча-сялянскага Савецкага Ураду Беларусі" – першы канстытуцыйны акт урада БССР. Распрацоўка асноў дзяржаўна-прававога будаўніцтва ў БССР ў дакументах 1-га і 2-га Усебеларускіх з' ездаў Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (люты 1919, снежань 1920).

Асноўныя тэндэнцыі развіцця палітыка-прававой думкі 1920-30 гг. Рэалізацыя ідэі дзяржаўнага суверэнітэту БССР у партыйна-дзяржаўнай практыцы Савецкай Беларусі. Замацаванне прынцыпаў незалежнасці і раўнапраўя ў Саюзным дагаворы 16 студзеня 1921 г. Удзел беларускага партыйнага кіраўніцтва ў распрацоўцы прынцыпаў аб'яднаня савецкіх рэспублік. Распрацоўка і рэалізацыя ідэалогіі беларусізацыі. Ідэалагічнае абгрунтаванне адыходу ад палітыкі беларусізацыі і станаўленне таталітарнай сістэмы. Развіццё прававой думкі Савецкай Беларусі. Асаблівасці падыходаў савецкай юрыдычнай навукі 1920-30-х гг. да праблем праваразумення. Станаўленне беларускай юрыдычнай навукі (Р. Парэчын, Л. Рудзіцкі, І. Пічэта, М. Грэдзінгер, Ф. Гаўзе і інш.).

Новыя тэндэнцыі ў грамадскай свядомасці, выкліканыя перамогай ў Вялікай Айчынай вайне. Падпольныя патрыятычныя арганізацыі "Чайка", "Саюз беларускіх патрыётаў (СБП), "Свабодная Беларусь". Барацьба з іншадумствам афіцыйнай пасляваеннай дзяржаўнай ідэалогіі.

Асноўныя тэндэнцыі ў ідэйнам жыцці паслясталінскай эпохі – дэмакратычная і кансерватыўная. Пашырэнне дагматызму, параднасці, славаслоўя ў тэарэтычнай думцы 1970-80-х гг. Падаўленне іншадумства.

Прававыя ідэі ў 1940-х – сярэдзіне 80-х гг. XX ст. Даследванне праблем дзяржаўнага і міжнароднага права (В. Дарогін, С. Віхараў, Ю. Броўка, В. Сярэбрэннікаў і інш.). Даследаванні ў галіне дзяржавы і права Беларусі (С. Маргунскі, В. Круталевіч, І. Марціновіч, І. Юхо). Даследаванні ў галіне грамадзянскага і грамадзянска-працэсуальнага права (Ф. Гаўзе, А. Рамановіч, В. Чыгір).

## Тэма 10. Палітычная і прававая думка Беларусі на сучасным этапе

Палітыка-эканамічныя рэаліі канца 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. і іх уздзеянне на палітыка-прававую думку Беларусі. Крытычны аналіз гісторыі СССР, палітычнай практыкі КПСС і савецкага кіраўніцтва ў палітычнай думцы. Развіццё гістарычнай думкі. Фарміраванне шматпартыйнасці. Палітычныя ідэі сучасных палітычных партый і грамадскіх рухаў Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыйны працэс і праблемы канстытуцыяналізма ў палітыка-прававой

думцы Беларусі 90-х г. XX – пачатку XXI ст. Пытанні грамадзянскай супольнасці, дэмакратычнай, прававой, сацыяльнай дзяржавы ў палітыка-прававой думцы. Праблемы формы дзяржаўнага кіравання ў палітычнай думцы. Праблема забеспячэння падзелу ўлад у прававой думцы. Абмеркаванне пытанняў судова-прававой рэформы. Праблема правоў чалавека ў сучаснай прававой думцы. Абмеркаванне пытанняў дзяржаўнай ідэалогіі ў палітычнай думцы. Праблемы прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці ва ўмовах рынкавых адносін.

Інтэграцыйныя ідэі ў палітычнай і прававой думцы. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці юрыдычнай навукі ў Рэспубліцы Беларусь.

**Вучэбна-метадычная карта па вучэбнай дысцыпліне**
**“Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі” для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | | | Іншае* | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Колькасць гадзін КСР: Л | Сз | Лаб | | |
| | **Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі (66 г.)** | **40** | | **20** | | **4** | **2** | | | |
| 1. | Прадмет, задачы, крыніцы, гістарыяграфія курса “Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі”. Праблемы перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі | 2 | | | | | | | [1, 5, 6, 8, 11, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, складанне плана-канспекта |
| 2. | Палітычная і прававая думка на беларускіх землях ў часы распаўсюджвання хрысціянства і ўтварэння першых дзяржаў-княстваў (X – першая палова XIII стст.) | 4 | | 2 | | | | | [1–6, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, работа з тэкстамі першакрыніц |
| 3. | Грамадска-палітычная і прававая думка ў перыяд станаўлення беларускага этнаса і ўмацавання дзяржаўнасці (другая палова XIII – XV стст.) | 4 | | 2 | | | | | [1–6, 8, 10–11, 13, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, рэфераты |
| 4. | Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі ( XVI – пачатак XVII ст.) | 4 | | 4 | | | | | [1–13, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, эсэ, тэставы кантроль |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5. | Палітычная і прававая думка перыяду Контррэфармацыі, Брэсцкай царкоўнай уніі і крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін (XVII – сярэдзіна XVIII ст.) | 4 | | 2 | | | | | [1–8, 10, 11, 15–17] | Франтальнае апытанне па тэме, круглы стол "Рэлігійныя ўніі ў палітыка-прававой думцы на беларускіх землях" |
| 6. | Палітычная і прававая думка Беларусі ў эпоху Асветніцтва (XVIII ст) | 4 | | 2 | | | | | [1–6, 8, 10, 11, 14–17] | Франтальнае апытанне па тэме, тэставы кантроль, дыскусія |
| 7. | Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) | 6 | | 2 | 2 | | | | [1–6, 8, 11, 14–17] | Франтальнае апытанне па тэме, эсэ, тэма па выбару. |
| 8. | Палітычная і прававая думка беларускага нацыянальнага Адраджэння ў канцы XIX – першай трэці XX ст. Ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці ў палітычнай думцы Беларусі (1914 – 1921 гг.) | 4 | | 2 | 2 | | 2 | | [1–4, 6, 8, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме; дыскусія па праблеме гістарычных альтэрнатыў дзяржаўнага развіцця Беларусі. |
| 9. | Палітычныя і прававыя ідэі Савецкай Беларусі | 4 | | 2 | | | | | [1–4, 6, 8, 14–15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме,кантрольная работа (3 варыянты) |
| 10. | Палітычная і прававая думка Беларусі на сучасным этапе | 4 | | 2 | | | | | [1–4, 6, 8, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, рэфераты, эсэ, тэставы кантроль. |
| | **Усяго гадзін** | **40** | | **20** | | **4** | **2** | | | |

* У раздзеле Іншае – літаратура ў квадратных дужках

**Вучэбна-метадычная карта па вучэбнай дысцыпліне**
**“Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі” для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | | | Іншае* | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Колькасць гадзін КСР | | | | |
| | | | | | | Л | Сз | Лаб | | |
| | **Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі (66 г.)** | **40** | | **20** | | **4** | **2** | | | |
| 1. | Прадмет, задачы, крыніцы, гістарыяграфія курса “Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі”. Праблемы перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі | 2 | | | | | | | [1, 5, 6, 8, 11, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, складанне плана-канспекта |
| 2. | Палітычная і прававая думка на беларускіх землях ў часы распаўсюджвання хрысціянства і ўтварэння першых дзяржаў-княстваў (X – першая палова XIII стст.) | 4 | | 2 | | | | | [1–6, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, работа з тэкстамі першакрыніц |
| 3. | Грамадска-палітычная і прававая думка ў перыяд станаўлення беларускага этнаса і ўмацавання дзяржаўнасці (другая палова XIII – XV стст.) | 4 | | 2 | | | | | [1–6, 8, 10–11, 13, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, рэфераты |
| 4. | Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі ( XVI – пачатак XVII ст.) | 4 | | 4 | | | | | [1–13, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, эсэ, тэставы кантроль |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 5. | Палітычная і прававая думка перыяду Контррэфармацыі, Брэсцкай царкоўнай уніі і крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін (XVII – сярэдзіна XVIII ст.) | 4 | |
| 6. | Палітычная і прававая думка Беларусі ў эпоху Асветніцтва (XVIII ст) | 4 | |
| 7. | Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) | 6 | |
| 8. | Палітычная і прававая думка беларускага нацыянальнага Адраджэння ў канцы XIX – першай трэці XX ст. Ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці ў палітычнай думцы Беларусі (1914 – 1921 гг.) | 4 | |
| 9. | Палітычныя і прававыя ідэі Савецкай Беларусі | 4 | |
| 10. | Палітычная і прававая думка Беларусі на сучасным этапе | 4 | |
| | **Усяго гадзін** | **40** | |

* У раздзеле Іншае – літаратура ў квадратных дужках

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | | | | | [1–8, 10, 11, 15–17] | Франтальнае апытанне на тэме, круглы стол "Рэлігійныя ўніі ў палітыка-прававой думцы на беларускіх землях" |
| 2 | | | | | [1–6, 8, 10, 11, 14–17] | Франтальнае апытанне на тэме, тэставы кантроль, дыскусія |
| 2 | 2 | | | | [1–6, 8, 11, 14–17] | Франтальнае апытанне на тэме, эсэ, тэма па выбару. |
| 2 | 2 | | 2 | | [1–4, 6, 8, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне на тэме: дыскусія па праблеме гістарычных альтэрнатыў дзяржаўнага развіцця Беларусі. |
| 2 | | | | | [1–4, 6, 8, 14–15, 17] | Франтальнае апытанне на тэме,кантрольная работа (3 варыянты) |
| 2 | | | | | [1–4, 6, 8, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне на тэме, рэфераты, эсэ, тэставы кантроль. |
| **20** | | **4** | **2** | | | |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦІПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ ПАЛІТЫЧНАЙ І ПРАВАВОЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ”**

на _______/_______ навучальны год

| №№ пп | Дапаўненні і змены | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры тэорыі і гісторыі права (пратакол № ____ ад ________ 202_ г.)

Загадчык кафедры,
д.ю.н., прафесар Д.М. Дземічаў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта права,
к.ю.н. А.М. Шклярэўскі

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ РАБОЧАЙ ПРАГРАМЫ ДЫСЦЫПЛІНЫ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ

| Назва дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з дысцыплінай навучальнай праграмы | Кафедра, якая забяспечвае вывучэнне дысцыпліны | Прапановы кафедры аб змяненні ў змест навучальнай праграмы | Прынятае рашэнне кафедрай, якая распрацоўвае навучальную праграму |
|---|---|---|---|
| 1. Міжнароднае прыватнае права | міжнароднага эканамічнага права | няма [подпіс] | пратакол № 12 от 11.05.21 |

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вучэбнай дзейнасці

Для ацэнкі дасягненняў студэнтаў па прадмеце рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі дыягностыкі:

| | |
|---|---|
| Вусная форма дыягностыкі кампетэнцый | калёквіум; рашэнне тэарэтычных і практычных задач; даклады на семінарскіх занятках; даклады на канферэнцыях |
| Пісьмовая форма дыягностыкі кампетэнцый | тэсты; кантрольныя апытанні; кантрольныя работы; пісьмовыя справаздачы па аўдыторным (хатнім) практычным практыкаваннях; пісьмовыя справаздачы па практыкумах; эсэ; рэфераты; публікацыі артыкулаў, дакладаў; ацэньванне па модульна-рэйтынгавай сістэме |
| Вусна-пісьмовая форма дыягностыкі кампетэнцый | справаздачы па хатнім тэарэтычным і практычным заданнях і задачах з іх вуснай абаронай; ацэньванне па модульна-рэйтынгавай сістэме; ацэньванне на аснове дзелавой гульні |
| Тэхнічная форма дыягностыкі кампетэнцый | электронныя тэсты; складанне і прадстаўленне прэзентацый. |

## Прыкладны пералік заданняў кіруемай самастойнай работы

Кіруемая самастойная работа студэнта прадугледжваецца па "Гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі" для дзённай формы атрымання адукацыі. Мэта кіруемай самастойнай работы – самастойнае авалоданне студэнтамі ведамі па пэўных тэмах дысцыпліны.

Задачы самастойнай работы:

• набыццё студэнтамі неабходных ведаў па названых тэмах;

• развіццё навыкаў самастойнага мыслення, умення аналізаваць вывучаны матэрыял;

• выпрацоўка навыкаў лагічнага і паслядоўнага выкладу вывучанага матэрыялу.

Форма кантролю – па выбару выкладчыка: эсэ, рэфераты, даклады, складанне і рашэнне тэставых заданняў, калёквіўмы, круглыя сталы, дзелавая гульня, комплексная кантрольная работа і інш.

| № п/п | Назва тэмы | Лекцыі | Семінары | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) | 2 | | Эсэ |
| 2. | Палітычная і прававая думка беларускага нацыянальнага Адраджэння ў канцы XIX – першай трэці XX ст. Ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці ў палітычнай думцы Беларусі (1914 – 1921 гг.) | 2 | 2 | Эсэ. Тэст |
| | **Усяго гадзін КСР** | **4** | **2** | |

12.Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – 316 с.
13.Пазднякоў, В.С. Помнікі права Беларусі XIV–XVI стст.: абласныя прывілеі: крыніцазн. дапам. / В.С. Пазднякоў. – Мінск: Беларус. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. справы, 2018. – 236 с.
14.Саракавік, І.А. Станаўленне і развіццё юрыдычнай навукі і адукацыі ў Беларусі / І.А. Саракавік. – Мінск: "Перасвет", 2013. – 324 с.
15.Славутыя імёны Бацькаўшчыны: зб. / уклад. У. Гілеп [і інш.]; рэдкал.: А. Грыцкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БФК, 2000. – 384 с.
16.Хайніцка, К. Гісторыя палітычных і прававых тэорый / К. Хайніцка, Г. Альшэўскі; пер. з пол. У. Маруціка; рэд. У. Маруцік. – Мінск: Медісонт, 2007. – 312 с.
17.Шчэрбік, Д.В. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: Вучэбна-метадычн. комплекс для студэнтаў спец. 1-24 01 02 "Правазнаўства" / Д.В. Шчэрбік. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – 352 с.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ ЧАСТКА

## Літаратура

### *Асноўная*

1. Вішнеўская, І.У. Палітычная і правая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый: манаграфія / І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей. 2008. – 295 с.

2. Довнар, Т.И. История государства и права Беларуси: учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по специальностям “Правоведение”, “Экономическое право”, “Политология (по направлениям)”. “Международное право” / Т.И. Довнар, Е.И. Орловская. – Минск: Издательский центр БГУ, 2017. – 191 с.

3. Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях “Правазнаўства”. “Паліталогія”, “Эканамічнае права”, “Міжнароднае права” / Т.І. Доўнар. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2014. – 415 с.

4. Новиков, Л.И. История политических и правовых учений: краткий курс лекций / Л.И. Новиков, Д.М. Пастухова. – Минск: Амалфея, 2019. – 155 с.

5. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі В.Ф. Шалькевіч. – Мінск: Маладзёжнае навук. супольніцтва, 2002. – 248 с.

### *Дадатковая*

6. Басюк, І.А. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : курс лекцый / І.А. Басюк. – Гродна: Гродзен. дзярж. ун-т, 2011. – 282 с.

7. Белорусские мыслители XVI – XVII вв. Избранные труды. – Минск: Редакция журнала “Промышленно-торговое право”, 2017. – 320 с.

8. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйшых навуч. устаноў / І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2004. – 272 с.

9. Вішнеўская, І.У. Карупцыя ў кантэксце палітыка-прававой думкі і заканадаўства Вялікага княства Літоўскага XV – XVI стст. / І.У. Вішнеўская // Проблемы управления: науч.-практ. журнал. – 2019. – № 2. – С. 112–119.

10. Вішнеўская, І.У. Спробы рэалізацыі ідэі рэлігійнай незалежнасці Беларусі ў XIV – XVIII стст. / І.У. Вішнеўская // Проблемы управления: науч.-практ. журнал. – 2020. – № 2. – С. 47–55.

11. Голубева, Л.Л. Станаўленне і развіццё палітыка-прававой думкі Беларусі / Л.Л. Голубева // Государство и право в XXI веке: материалы междунар. научно-практ. конференции, посвященной 95-летию юридического факультета Белор. госуд. университета, 26-27 нояб. 2020 г., г. Минск / БГУ, Юридический фак. [редкол.: Т.Н. Михалёва (гл. ред.) и др.]. – Минск: БГУ, 2021. – С. 138 – 142.

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | |
| 26. | Палітычная і прававая думка Беларусі ў эпоху Асветніцтва (XVIII ст) | 1 | |
| 27. | Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) | 1 | |
| 28. | Палітычная і прававая думка беларускага нацыянальнага Адраджэння ў канцы XIX – першай трэці XX ст. Ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці ў палітычнай думцы Беларусі (1914 – 1921 гг.) | 2 | |
| 29. | Палітычныя і прававыя ідэі Савецкай Беларусі | 1 | |
| 30. | Палітычная і прававая думка Беларусі на сучасным этапе | | |
| | **Усяго гадзін** | **10** | |

* У раздзеле Іншае – літаратура ў квадратных дужках

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | на беларускіх землях" |
| | | | | | [1–6, 8, 10, 11, 14–17] | Франтальнае апытанне на тэме, тэставы кантроль, дыскусія |
| | | | | | [1–6, 8, 11, 14–17] | Франтальнае апытанне на тэме, эсэ, тэма на выбару. |
| | | | | | [1–4, 6, 8, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне на тэме; дыскусія на праблеме гістарычных альтэрнатыў дзяржаўнага развіцця Беларусі. |
| | | | | | [1–4, 6, 8, 14–15, 17] | Франтальнае апытанне на тэме,кантрольная работа (3 варыянты) |
| | | | | | [1–4, 6, 8, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне на тэме, рэфераты, эсэ, тэставы кантроль. |
| 24 | | | | | | |

**Вучэбна-метадычная карта па вучэбнай дысцыпліне**
**"Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі" для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі (ВШУБ)**

| Нумар раздзела. | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | | | Іншае* | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Колькасць гадзін КСР | | | | |
| | | | | | | Л | Сз | Лаб | | |
| | **Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі (14 г.)** | **10** | | **4** | | | | | | |
| 21. | Прадмет, задачы, крыніцы, гістарыяграфія курса "Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі". Праблемы перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі | 1 | | | | | | | [1, 5, 6, 8, 11, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, складанне плана-канспекта |
| 22. | Палітычная і прававая думка на беларускіх землях ў часы распаўсюджвання хрысціянства і ўтварэння першых дзяржаў-княстваў (X – першая палова XIII стст.) | 1 | | | | | | | [1–6, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, работа з тэкстамі першакрыніц |
| 23. | Грамадска-палітычная і прававая думка ў перыяд станаўлення беларускага этнаса і ўмацавання дзяржаўнасці (другая палова XIII – XV стст.) | 1 | | | | | | | [1–6, 8, 10 11, 13, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, рэфераты |
| 24. | Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі ( XVI – пачатак XVII ст.) | 2 | | | | | | | [1–13, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, эсэ, тэставы кантроль |
| 25. | Палітычная і прававая думка перыяду Контррэфармацыі, Брэсцкай царкоўнай уніі і крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін (XVII – сярэдзіна XVIII ст.) | | | 2 | | | | | [1–8, 10, 11, 15–17] | Франтальнае апытанне па тэме, круглы стол "Рэлігійныя ўніі ў палітыка-прававой думцы |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | (XVII – сярэдзіна XVIII ст.) | | |
| 16. | Палітычная і прававая думка Беларусі ў эпоху Асветніцтва (XVIII ст) | 2 | |
| 17. | Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) | 2 | |
| 18. | Палітычная і прававая думка беларускага нацыянальнага Адраджэння ў канцы XIX – першай трэці XX ст. Ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці ў палітычнай думцы Беларусі (1914 – 1921 гг.) | 2 | |
| 19. | Палітычныя і прававыя ідэі Савецкай Беларусі | 1 | |
| 20 | Палітычная і прававая думка Беларусі на сучасным этапе | | |
| | **Усяго гадзін** | **12** | |

* У раздзеле Іншае – літаратура ў квадратных дужках

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | палітыка-прававой думцы на беларускіх землях" |
| | | | | | [1–6, 8, 10, 11, 14–17] | Франтальнае апытанне па тэме, тэставы кантроль, дыскусія |
| | | | | | [1–6, 8, 11, 14–17] | Франтальнае апытанне па тэме, эсэ, тэма на выбару. |
| | | | | | [1–4, 6, 8, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме; дыскусія па праблеме гістарычных альтэрнатыў дзяржаўнага развіцця Беларусі. |
| | | | | | [1–4, 6, 8, 14–15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме.кантрольная работа (3 варыянты) |
| 2 | | | | | [1–4, 6, 8, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, рэфераты, эсэ, тэставы кантроль. |
| 4 | | | | | | |

**Вучэбна-метадычная карта па вучэбнай дысцыпліне**
**"Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі" для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | | | Іншае* | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Колькасць гадзін КСР | | | | |
| | | | | | | Л | Сз | Лаб | | |
| | **Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі (16 г.)** | **12** | | **4** | | | | | | |
| 11. | Прадмет, задачы, крыніцы, гістарыяграфія курса "Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі". Праблемы перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі | 1 | | | | | | | [1, 5, 6, 8, 11, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, складанне плана-канспекта |
| 12. | Палітычная і прававая думка на беларускіх землях у часы распаўсюджвання хрысціянства і ўтварэння першых дзяржаў-княстваў (X – першая палова XIII стст.) | 1 | | | | | | | [1–6, 11, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, работа з тэкстамі першакрыніц |
| 13. | Грамадска-палітычная і прававая думка ў перыяд станаўлення беларускага этнаса і ўмацавання дзяржаўнасці (другая палова XIII – XV стст.) | 1 | | | | | | | [1–6, 8, 10, 11, 13, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, рэфераты |
| 14. | Развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі ( XVI – пачатак XVII ст.) | 2 | | | | | | | [1–13, 15, 17] | Франтальнае апытанне па тэме, эсэ, тэставы кантроль |
| 15. | Палітычная і прававая думка перыяду Контррэфармацыі, Брэсцкай царкоўнай уніі і крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін | | | 2 | | | | | [1–8, 10, 11, 15–17] | Франтальнае апытанне па тэме, круглы стол "Рэлігійныя уніі ў |